4. *Карней И.* Рокировка в IBB // Свободные новости. – 2000. – 10–17 марта. – С.3.

5. *Премия* европейского согласия присуждена Светлане Алексиевич// Deutschland. – 1998. – № 2. – С. 31.

6. *Rasanau Ales.* Zeichen vertikaler Zeit. – Berlin: Adora Verlag, 1995.

7. *Грамыка Л.* Ёсць улюбёнцы лёсу// Мастацтва. – 1997. – № 5. – С. 67–70.

8. *Папова А.* Дрэздэн / “Маленькія радасці жывых” / Гутарыла Р.Баравікова // Алеся. – 1997. – № 7. – С.16–17.

9. *Мушынская Т.* Прыз “Бенуа дэ ля данс” – балету “Страсці” // Мастацтва. – 1996. – № 9. – С.13–14.

*Ю.М.Макушынская*

## МІЖНАРОДНЫЯ ДАГАВОРЫ ЯК ЧАСТКА БІБЛІЯТЭЧНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Многія аспекты бібліятэчнай дзейнасці, значныя для сусветнай суполкі, знайшлі адлюстраванне ў дзеючых міжнародных дагаворах. У адпаведнасці з Канстытуцыяй (артыкул 8) "Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства". Законам "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь" (артыкул 3) замацавана, што "нормы ўступіўшых у сілу міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца часткай дзеючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь заканадаўства аб бібліятэчнай справе".

У апошняе дзесяцігоддзе XX ст. Рэспубліка Беларусь атрымала магчымасць самастойна вызначаць сваю ўнутраную і знешнюю культурную палітыку, распрацоўваць нарматыўныя прававыя асновы міжнароднага культурнага ўзаемадзеяння, заключаць дагаворы з замежнымі краінамі і арганізацыямі, фарміраваць механізм іх рэалізацыі.

Развіццё дагаворна-прававой базы міжнародных культурных адносін стала прыярытэтным кірункам дзейнасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, за якім замацавана роля каардынатара культурнага абмену. У 1995 г. на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры і друку была абмеркавана Канцэпцыя развіцця міжнародных сувязей. У дакуменце сфармуляваны мэты і задачы развіцця міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, якія Міністэрства бачыла перш за ўсё ў аб'яднанні беларускай культуры і мастацтва з духоўным жыццём свету, з еўрапейскай сусветнай прасторай, міжнародным кніжным рынкам.

Значным кірункам рэалізацыі знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца пашырэнне міжнароднай дагаворна-прававой базы культурнага супрацоўніцтва. У 90-я гг. Беларусь заключыла рад пагадненняў з аўтарытэтнымі міжнароднымі арганізацыямі, падпісала важныя міжнародныя канвенцыі ў сферы культуры. Этапам для міжнароднага супрацоўніцтва Беларусі стала яе далучэнне ў 1993 г. да Еўрапейскай культурнай канвенцыі. Канвенцыя разглядае культурныя каштоўнасці кожнай дзяржавы ў якасці неад'емнай часткі агульнага культурнага здабытку Еўропы. У канвенцыі зацвярджаецца прынцып іх свабоднага перамя- шчэння і абмену з абавязковым кантролем за захаванасцю.

Развіццё дагаворных адносін Рэспублікі Беларусь здзяйсняецца па двух напрамках: дагаворныя адносіны на ўзроўні СНД і дагаворныя адносіны на ўзроўні сусветнай суполкі.

Па меры развіцця СНД стала магчымым аднаўленне міждзяржаўнага міжбібліятэчнага ўзаемадзеяння, якое было парушана пасля распаду СССР. Адасабленне дзяржаў былога Саюза ў пачатку 90-х гг. прывяло да разбурэння адзінай сістэмы абавязковага экземпляра, міжбібліятэчнага абанемента, скарачэння кнігаабмену. Тое, што здарылася, супярэчыла асноўнай міжнароднай тэндэнцыі – узмацненню міжнароднага ўзаемадзеяння ў сферы эканомікі і гуманітарных сувязей, узмацненню інфармацыйнага ўзаемадзеяння, паступоваму фарміраванню інфармацыйна-бібліятэчнай прасторы з мэтай забеспячэння ўзаемнага доступу да інфармацыі, культурных рэсурсаў праз бібліятэкі.

Захаванне і развіццё гістарычна склаўшыхся бібліятэчна-інфармацыйных сувязей з улікам нормаў міжнароднага права з’яўляецца адным з важнейшых кірункаў міждзяржаўных інтэграцыйных працэсаў. Пагадненнем кіраўнікоў урадаў СНД 1992 г. "Аб супрацоўніцтве ў галіне культуры" было за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мацавана, што "бакі гарантуюць даступнасць склаўшыхся збораў, калекцый і іншых культурных каштоўнасцей, якія ўтвараюць бібліятэчны, музейны і архіўны фонды незалежных дзяржаў, для грамадзян дзяржаў-удзельніц гэтага пагаднення ў роўнай ступені і на тых жа ўмовах, што і для сваіх грамадзян" (артыкул 3); "бакі абавязуюцца на аснове ўзгодненых праграм культурнага супрацоўніцтва і прамых дагаворных сувязей садзейнічаць ... узаемнай пастаўцы ў нацыянальныя фондасховішчы абавязковых экземпляраў друкаванай прадукцыі, фота- і фондадакументаў, стварэнню інтэграваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, зводных каталогаў і міжбібліятэчных абанементаў …" (артыкул 4).

У 1992 г. у адпаведнасці з пагадненнем краін-удзельніц СНД ствараецца Міжпарламенцкая асамблея (МПА) – рабочы кансультацыйны орган міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Адна з формаў работы МПА – прыняцце рэкамендацыйных заканадаўчых актаў па найбольш значных пытаннях, якія ўяўляюць узаемны інтарэс. У 1992 г. ствараецца Бібліятэчная асамблея Еўразіі (БАЕ) – добраахвотнае аб'яднанне бібліятэкараў, бібліятэк і бібліятэчных суполак Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кіргізіі, Расіі, Таджыкістана, Туркменіі, Узбекістана, Украіны. БАЕ выступае ініцыятарам стварэння асноў прававога збліжэння бібліятэчнай справы краін СНД. Паколькі распрацоўка адзіных або тыпавых законаў непрымальная для ўзаемаадносін суверэнных дзяржаў, а сфера для заключэння міжнародных пагадненняў (міждзяржаўных ці міжурадавых) дастаткова абмежаваная, таму што міжнароднае пагадненне з'яўляецца актам абавязковага дзеяння, па гэтай прычыне МПА была абрана форма рэкамендацыйнага мадэльнага закона. Прыклады рэкамендацыйных актаў існуюць у міжнароднай практыцы даўно, у тым ліку і ў бібліятэчнай сферы; найбольш вядомыя рэкамендацыйныя грамадска-прафесійныя акты – "Бібліятэчны біль аб правах", "Маніфест ЮНЕСКА аб публічных бібліятэках".

Форма мадэльнага ці рэкамендацыйнага акта аптымальная для стварэння базы, на аснове якой можна праводзіць мерапрыемствы па уніфікацыі бібліятэчнага заканадаўства розных краін, бо мадэльныя заканадаўчыя акты не з'яўляюцца ні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

законамі, ні міждзяржаўнымі пагадненнямі, але могуць выкарыстоўвацца ў якасці асновы для першага і другога.

Першым рэкамендацыйным актам у сферы бібліятэчнай справы СНД з'яўляецца акт "Аб адзінай палітыцы ў галіне абавязковага экземпляра дакументаў". Прафесійная падтрымка мадэльнага акта абумовіла прыняцце рашэння аб падрыхтоўцы некалькіх рэкамендацыйных актаў, аб'яднаных у адзіны кодэкс – Мадэльны бібліятэчны кодэкс дзяржаў-удзельніц СНД. Як і іншыя мадэльныя законы, Мадэльны бібліятэчны кодэкс створаны як база для наступнай распрацоўкі нацыянальнага заканадаўства дзяржавамі-ўдзельніцамі СНД. Пры гэтым міжбібліятэчны кодэкс мае на мэце аднавіць міжбібліятэчнае супрацоўніцтва, якое існавала на тэрыторыі былога Саюза, і спрыяць будаўніцтву бібліятэчнай справы на міжнароднай і ўнутрыдзяржаўнай прасторы.

Распрацоўка мадэльных рэкамендацыйных актаў мае вялікае значэнне для ўсіх краін СНД. Мадэльныя акты, якія распрацоўвае БАЕ ў галіне бібліятэчнай справы, кладуцца ў аснову ствараемых у Рэспубліцы Беларусь нарматыўных прававых актаў. У прыватнасці, другая частка Мадэльнага бібліятэчнага кодэкса была выкарыстана пры падрыхтоўцы новай рэдакцыі закона Рэспублікі Беларусь "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь" 2002 г.; пры рабоце над праектам закона "Аб абавязковым экземпляры дакументаў", дзе быў выкарыстаны рэкамендацыйны заканадаўчы акт "Аб адзінай палітыцы ў галіне абавязковага экземпляра дакументаў".

Важна заўважыць, што краіны СНД не толькі сумесна распрацоўваюць мадэльныя рэкамендацыйныя акты, але і падпісваюць значныя для развіцця бібліятэк дакументы. Сярод пагадненняў, заключаных паміж краінамі СНД у 90-я гг. і якія непасрэдна датычацца дзейнасці бібліятэк, можна адзначыць:

– Пагадненне аб супрацоўніцтве дзяржаў-удзельніц СНД у галіне перыядычнага друку (04.06.1999);

– Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне кнігавыдання, кнігараспаўсюджання і паліграфіі (10.02.1995);

– Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(15.05.1992);

– Пагадненне Урада Расійскай Федэрацыі, Урада Рэспублікі Беларусь аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі і навукі (21.02.1995) і інш.

Большасць пагадненняў паміж краінамі СНД накіравана на арганізацыю сумеснай работы ў галіне культурнай палітыкі. Усе яны, як правіла, спрыяюць стварэнню папярэдняй правовай базы для далейшага супрацоўніцтва дзяржаў і уніфікацыі іх заканадаўства.

Вялікае значэнне для развіцця бібліятэк краіны маюць міжнародныя канвенцыі і пагадненні. Частка з іх ратыфікавана на тэрыторыі Беларусі, частка рыхтуецца да ратыфікацыі. Значнымі для функцыянавання бібліятэк з'яўляюцца паштовыя пагадненні і канвенцыі, пагадненні ў галіне аўтарскіх правоў. Сярод ратыфікаваных міжнародных дакументаў вылучаюцца:

– Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА);

– Канвенцыя аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы права ўласнасці на культурныя каштоўнасці;

– Сусветная паштовая канвенцыя;

– Бернская канвенцыя аб ахове літаратурных і мастацкіх твораў;

– Дагавор Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці па аўтарскім праве.

Далейшаму развіццю беларускіх бібліятэк, умацаванню іх на інфармацыйна-бібліятэчнай сусветнай прасторы значна паспрыяе ратыфікацыя наступных пагадненняў і канвенцый:

– Пагадненне аб увозе матэрыялаў адукацыйнага, навуковага і культурнага характару ("Фларэнтыйскае пагадненне"). Гэтым пагадненнем і пратаколам да яго (1976) дэкларуюцца льготныя ўмовы для ўвозу дакументаў у краіну. Пералік дакументаў уключае не толькі друкаваныя формы, але і аўдыёвізуальную прадукцыю, і кнігі для сляпых, і інш. Акрамя фінансавых ільгот, пагадненне прапануе дзяржавам "спрасціць адміністрацыйную працэдуру", звязаную з увозам;

– Канвенцыя аб міжнародным абмене выданнямі. Канвен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыя абвяшчае магчымасць стварэння дзяржавамі, якія дагаворваюцца, рэжыму найбольшага спрыяння для абмену выданнямі, у прыватнасці паміж бібліятэкамі як культурнымі ўстановамі. Сутнасць асноўных нормаў Канвенцыі заключаецца ў тым, што дзяржавы, якія дагаворваюцца, бяруць абавязацельствы па арганізацыі нацыянальных службаў кнігаабмену, каардынацыі работы паміж органамі і ўстановамі, якія ўдзельнічаюць у гэтым працэсе;

– Канвенцыя аб абмене афіцыйнымі выданнямі і ўрадавымі дакументамі паміж дзяржавамі. Канвенцыя з'яўляецца прававой асновай узаемадзеяння бібліятэк па абмену вызначаных відаў выданняў. У выніку гібкасці фармулёвак дазволена ўстанаўліваць абмен афіцыйнымі выданнямі, зыходзячы з сапраўднай зацікаўленасці ў іх. Асноўнай умовай узаемадзеяння з'яўляецца ўзаемаабмен.

Такім чынам, бібліятэчнае заканадаўства Рэспублікі Беларусь, з аднаго боку, распрацоўваецца з улікам міждзяржаўных патрабаванняў, а з другога, пашыраецца за кошт нормаў міжнародных канвенцый і пагадненняў, што, безумоўна, спрыяе стварэнню больш трывалай прававой базы для дзейнасці бібліятэк краіны.

---


1. *Аб унясенні* змяненняў і дапаўненняў у закон Рэспублікі Беларусь "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь": Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2002 г., № 147-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002. – № 128 (2/896).

2. *Борисова Е.* Три кита, на которых держится библиотека // Независимый библиотечный адвокат. – 2000. – № 1. – С.23–29.

3. *Всемирная* конвенция об авторском праве: [Извлечение] // Библиотека и закон: Справочник / Ред.-сост. Л.В.Фирсова. – М.: Либерея, 1997. – Вып. 2. – 472 с.

4. *Гриханов Ю.А.* Новые рубежи библиотечного законодательства в России и странах Содружества Независимых Государств // НТБ. – 2000. – № 1. – С. 65 – 69.

5. *Европейская* культурная конвенция // Информационно-библиотечная сфера: международные акты и рекомендации: Сб. справочно-норматив. и рек. материалов. – М.: Либерея,


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2001. – С. 18 –21.
6. *Конституция* Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями 1996 г.) // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 1999. – № 1 (1/0).
7. *О единой* политике в области обязательного экземпляра документов: Постановление Межпарламентской ассамблеи государств-участников Содружества Независимых Государств о рекомендательном законодательном акте // Информационный бюллетень РБА. – 1995. – № 2. – С. 65 – 79.
8. *О сотрудничестве* в области культуры: Соглашение-Совет глав правительств СНГ от 15.05.1992 г. // Содружество: Информ. вестник Совета глав государств и Совета глав правительств СНГ. – 1992. – №5(5).
9. *Российским* библиотекам – прочную законодательную базу: Ответы председателя Государственной думы Федерального собрания Российской Федерации Г.Н.Селезнева на вопросы редакции журнала "Библиотековедение" // Библиотековедение. – 2002. – № 2. – С. 19.
10. *Соглашение* о ввозе материалов образовательного, научного и культурного характера ("Флорентийское соглашение") // Библиотека и закон: Юридический журнал-справочник / Ред.-сост. О.Р.Бородин, Л.В.Фирсова. – М.: Изд-во "Либерея-Бибинформ", 1999. – Вып. 7 (2'99). – С. 157 – 164.
11. *Соловьев В.Н.* Что такое модельный библиотечный кодекс? // Библиотека и закон. – 1996. – Вып. 1. – С. 117 – 118.
12. *Фирсов В.Р.* Государственное законодательное регулирование деятельности библиотек / Российская национальная библиотека; Ред. М.А.Логинова. – СПб., 2000. – 256 с.
13. *Шадурский В.* Внешняя культурная политика Республики Беларусь: состояние и проблемы // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2000. – № 4.

*А.І.Мехавіч*

## ДА ПЫТАННЯ АБ ПРАФЕСІЙНЫХ ЯКАСЦЯХ КІРАЎНІКА КАЛЕКТЫВУ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ